# Прадметы разгляду

Набыцьцё ведаў можна разглядаць ня толькі як працэс станаўл[еньня], а і як працэс адмаўленьня няведаньня, як працэс вызваленьня ад цемры, як працэс пераходу з няведаньня ў веданьне. Так і працэс усякага пазнаньня ёсьць працэс ня толькі набываньня, але і працэс выдаленьня, вызваленьня з процілеглага. Гэта вынікае з разгляду ўсяго, што даступна гэтаму разгляду, у процілегласьцях існага, з разгляду ўсяго ў яго пераходах ад аднае процілегласьці ў другую, з аднаго стану ў другі, з разгляду ўсяго існага ў яго руху. Пераход да таго, чаго няма, ёсьць выхад з таго, што ёсьць, і наадварот. Уваход у будучыню ёсьць выхад з сучаснага.

---

Прадметы, што патрабуюць досьледу і ўтварэньня паняцьця свайго: I — 1) шчасьце, 2) слава, 3) честь, гонар, дружба, каха[ньне], любоў, 4) сумленьне, 5) доўг, абавязак, павіннасьць і добрая воля, 6) павага, пашана; II — 1) краса, прыгожасьць, хараство, 2) вялікасьць, вялічавасьць, узьнёсласьць, 3) сымпатычна[сьць]; III — 1) розум, 2) развага, 3) сьвядомасьць, пачуцьцё, адчуваньне, настрой, прадчувань[не], 4) паняцьце, 5) суджэньне, 6) ідэя, 7) мысьль, думка, 8) мысьленьне; IV — 1) права, 2) грамада, 3) асоба, 4) маса, 5) кляса, 6) стан, сям'я; V — 1) навука, 2) мастацтва, 3) поэзія; VI — 1) жыцьцё, 2) быт, 3) існаваньне; VII — 1) Інш. Да таго–ж і ўсё процілеглае гэтаму.

---

Чалавека можна разглядаць як асобны сьвет з сваімі законамі і ўстанаўленьнямі і як вязло ў будове людзкой, а также і прыродн[ай].

*[1931 — 1932]*